Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 278 (5354). НЯДЗЕЛЯ 8 СНЕЖНЯ 1935 г. Год выдання XVIII

# БОЛЬШЭВІЦКАЕ ПРЫВІТАННЕ ЭНТУЗІЯСТАМ БАРАЦЬБЫ ЗА ЛЁН, МАЙСТРАМ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ІЛЬНАВОДСТВА



Нарада перадавых калгаснікаў і калгасніц Таджыкістана і Туркменістана з кіраўнікамі партыі і Ўрада (ў Крэмлі 4 снежня 1935 г.) НА ЗДЫМКУ: дванаццацігадовая калгасніца калгаса імя Лахуці (Сталінабадскага раёна Таджыкскай ССР) т. Нахангова Мамлакат падносіць таварышу Сталіну ў падарунак кнігу Сталіна аб Леніне на таджыкскай мове.

Фото Б. ІГНАТОВІЧА (Саюзфото)

## СТАЛІНСКАЕ ЗАДАННЕ

Чытала і ўважліва абдумвала кожнае слова з прамовы таварыша Сталіна на нарадзе камбайнераў і камбайнерак. Камбайнерка — слова такое цяжкое, ледзь вымавіш. А такое яно радаснае і роднае — машына значыцца такая — камбайн, — якая нашу працу аблягчае. І жне, і малоціць адразу. І ў мяшкі ссыпае. А таварыш **Сталін**, як заўсёды, пра нас, жанчын, турбуецца, каб больш такіх машын у краіне было, якія і заможнасць нашу павялічваюць і жыццё нашае больш радасным робяць.

І яшчэ таварыш **Сталін** правільна сказаў, што глыбока ў галаву ўрэзалася, — гэта аб ураджайнасці нашых палёў. Нізкія, нізкія ў нас ураджаі. Асабліва па ільну. Лён трапаць мы больш-менш навучыліся. Некаторыя з нас нават і не дрэнна лён трэплюць. І кілограмаў багата даюць і нумары высокія. Проста радасна глядзець, як шырока разгарнуўся стаханаўскі рух сярод ільнаводаў БССР. Чытаю газету і бачу, што і ў Віцебску, і ў Дуброўне, і ў Суражы, у Талачыне і Полацку дзесяткі калгаснікаў і калгасніц па-новаму арганізоўваюць працу на трапанню і пачалі 30—40 нават 70 і больш кілограмаў вытрапваць. Вось што значыць, калі прыкладам аднаго захапляюцца і другія, калі вопытам і дасягненнямі аднаго партыя наша ўзбройвае ўсіх.

Але гэтага сёння ўжо мала. Нам трэба, каб калгас здаў з гектара не 2 цэнтнеры валакна, а 5 і нават болей. Мы — багацейшая ў свеце краіна. З такімі людзьмі, як нашы, можна такія цуды зрабіць, што нікому і ніколі не снілася.

Вось таму мы ў нашым калгасе цяпер разгарнулі такую работу, каб на лета 5 цэнтнераў з гектара абавязкова ўзяць валакна. Як багацейшымі сталі, сыцейшымі, лепш апранацца пачалі, мы ўсё больш адчуваем, што з кожным годам нам усяго трэба будзе больш і больш, у тым ліку і валакна. Так што сёння, калі мы з радасцю адзначаем, што наша рэспубліка выканала план ільнозагатовак, мне хочацца сказаць, што на гэтым **усебеларускі паход імя т. Гікало за лён не скончыўся.** Мы яго толькі цяпер па-сапраўднаму пачнем, каб у будучым годзе даць краіне валакна ў два разы больш, чым сёлета, каб узяць такі высокі ўраджай, які даў-бы нам права сказаць т. Сталіну — тваё баявое заданне аб павышэнні ўраджайнасці мы з гонарам выканалі.

**ПРАСКОЎЯ ПЯРЦОВА,**
**калгас «Віцебскі пралетарый», Лёзнянскага раёна.**

## Лён

Як на поле, на зямлю
Прышла раніца вясны.
Я пасеяла ў раллю
Жменю зёран ільняных.

Неба сеяла цяпло,
Цёплы дожджык цярушыў,
Ў думках радасна было,
Беглі песні ад душы.

Ой, лянок, лянок мой чысты,
Валакністы, залацісты!
Як расці стаў, як падрос,
Як лісткі ўзняў да гары, —

Як ішла лён абіваць,
Пад нагамі цёрся жвір, —

Нібы семя арфаваць,
За мной следам брыгадзір.
А мой пранік лясь ды лясь
Па гліняным па таку

Падышоў бліжэй Міхась,
Мне паклаў за стан руку.
Ой, лянок, лянок мой чысты,
Валакністы, залацісты!

А як слала я лянок,
На зялёным, на лугу,
Дзе папаўся Міхасёк,



Н. Ф. ГІКАЛО на Ўсебеларускім злёце ільнотрапальшчыц-ударніц.

**МЫ ПАСТАРАЕМСЯ ЗРАБІЦЬ ТАК, КАБ ЛЁН СТАЎ ВАЖНЕЙШАЙ СПРАВАЙ У НАШАЙ РЭСПУБЛІЦЫ, КАБ ЛЁН ЗРАБІЎСЯ ТАКОЙ СПРАВАЙ, ВАКОЛ ЯКОЙ РАСЛІ-Б ГАНАРОВЫЯ ЛЮДЗІ — ГЕРОІ І ГЕРАІНІ ПРАЦЫ. ТРЭБА ЗРАБІЦЬ ТАК, КАБ ЛЮДЗІ Ў КАЛГАСАХ, ЯКІЯ ПРАЦУЮЦЬ НА ІЛЬНЕ, БЫЛІ-Б САМЫМІ ГАНАРОВЫМІ ЛЮДЗЬМІ. ТРЭБА ДАБІЦЦА, КАБ МЫ ПА ІЛЬНУ БЫЛІ-Б ПЕРШЫМІ Ў СОВЕЦКІМ САЮЗЕ. ТРЭБА ЗРАБІЦЬ ТАК, КАБ МЫ АПРАЎДАЛІ ТЫЯ САПРАЎДЫ БАЦЬКОЎСКІЯ АДНОСІНЫ ДА НАШАЙ СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ, ДА БЕЛАРУСКАГА НАРОДУ З БОКУ ТАВАРЫША СТАЛІНА, ЯКІЯ МЫ ЗАЎСЁДЫ АДЧУВАЕМ.**

(З прамовы сакратара ЦК КП(б)Б тав. **Н. Ф. ГІКАЛО** на Ўсебеларускім злёце трапальшчыц-ударніц).

## *Цэнтральнаму камітэту комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі тав. ГІКАЛО*

Гарадскі і цэнтральны профса- Мы разумеем указанне права-

